УДК 808.26(053)

В.І. РАГАЎЦОЎ

ВЕРБАЛЬНАЕ ВЫРАЖЭННЕ КАМІЧНАГА Ў П'ЕСЕ КАСТУСЯ ГУБАРЭВІЧА "БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ"

Камічны эфект дасягаецца ўжываннем як спецыялізаваных, так і (часцей) неспецыялізаваных сродкаў. Спецыялізаваныя сродкі – такія, для якіх камічная функцыя з'яўляецца сталай, узуальнай (міжмоўнааманімічныя каламбуры). Неспецыялізаваныя сродкі – такія, для якіх камічная функцыя не з'яўляецца асноўнай (тыповай). Гэта іншамоўныя ўкрапіны (кантамінаваныя: беларуска-нямецкія і руска-нямецкія; змешаныя: частковыя і кантамінаваныя), экспрэсіўна зніжаныя адзінкі (словы, свабодныя словазлучэнні, фразеалагізмы), метанімізмы, параўнанні, сінтаксічныя і лексічныя аказіяналізмы і інш. У дасягненні камічнага эфекту прыкметную ролю адыгрываюць прыёмы парэмійнай алюзіі і пераўвасаблення. У рэалізацыі моўнымі адзінкамі камічнай экспрэсіі важную функцыю выконваюць актуалізатары, а ва ўзмацненні яе – інтэнсіфікатары (канцэнтраванае і комплекснае ўжыванне вербальных сродкаў).

Уводзіны

К. Губарэвіч – аўтар п'ес "Цэнтральны ход" (пастаўлена ў 1948 г.) і "Алазанская даліна" (1949 г.; напісаны разам з І. Дорскім), "Простая дзяўчына" (1953 г.), "На крутым павароце" (1956 г.), "Галоўная стаўка" (1957 г.), "Далёкая песня" (1962 г.), "А куды ж нам падзецца" (1963 г.), "Салодкі месяц" (1970 г.), "Брэсцкі мір" (1969 г.), "Партызанская зона" (1976 г.), "Даруй мне" (1980 г.) і інш.

Жанравы дыяпазон драматургічнай творчасці К. Губарэвіча шырокі і разнастайны: "гістарычна-рэвалюцыйная і гераічная драма, лірычная і сатырычная камедыя, фарс і вадэвіль" [1, с. 274].

П'еса "Брэсцкая крэпасць" (як і "Брэсцкі мір", "Галоўная стаўка") па сутнасці была "адкрыццём не толькі ў беларускай драматургіі" [2, с. 210].

Першы варыянт п'есы меў назву "Цытадэль славы" (надрукаваны ў часопісе "Полымя", 1952, № 1). У гэтым творы ўпершыню ў савецкай літаратуры апавядалася пра мужную барацьбу, неўміручы подзвіг абаронцаў крэпасці над Бугам, якія першымі прынялі на сябе ўдар нямецкіх захопнікаў [3, с. 217].

"Брэсцкая крэпасць" – гэта амаль новы варыянт п'есы, якая «па сваіх вартасцях шмат у чым пераўзыходзіла "Цытадэль славы"» [2, с. 209].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Упершыню п'еса пастаўлена Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы ў 1950 г. Пад назвай "Брэсцкая крэпасць" у пастаноўцы Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра (з 1953 г., прэмія Ленінскага камсамола Беларусі, 1967 г.) атрымала шырокае прызнанне ў Беларусі і за яе межамі.

Ужо ў адной з першых п'ес "Алазанская даліна", у якой усё дзеянне "набыло камедыйную інтэрпрэтацыю" [4, с. 22], шырока выкарыстоўваецца прыём "вадэвільных паўтарэнняў адных і тых жа сітуацый" з мэтай "нарастання камізму" [5, с. 108], "нагнятання смешных сітуацый і здарэнняў", што з'яўляецца "істотнай асаблівасцю камізму" [6, с. 177] твора.

Элементамі камізму напоўнены не толькі творы камедыйнага жанру, але і драмы, героі якіх, самыя звычайныя людзі, і ў нялёгкі, суровы час не страчваюць дасціпнасці, пачуцця гумару, што дапамагае ім выжыць і ў неймаверна цяжкіх умовах і па-геройску змагацца з ворагам.

Асноўная частка

Найважнейшыя вербальныя сродкі (прыёмы) стварэння камічнага эфекту ў п'есе "Брэсцкая крэпасць" наступныя.

Інпамоўныя ўкрапіны. Камічная функцыя ўкрапін абумоўліваецца кантрастам паміж звыкласцю іх графічнага афармлення ў мове-пазычальніцы, але нязвыкласцю фанетычна-граматычнай формы або незразумеласцю лексічнага значэння.

У п'есе сустракаюцца наступныя тыпы ўкрапін.

І. Кантамінаваныя ўкрапіны. Яны з'яўляюцца вынікам узаемадзеяння элементаў дзвюх моў – роднай для персанажа і замежнай. У чужым маўленні білінгва пад уплывам роднай мовы назіраюцца адхіленні ад літаратурных нормаў. Сярод кантамінаваных украпін ужываюцца:

а) беларуска-нямецкія ўкрапіны. З імі сустракаемся ў беларускай мове немцаў, якія недастаткова валодаюць ёю і таму ўжываюць моўныя адзінкі, часткова афармленыя па законах нямецкай мовы: [Крафт:] *За свой жарт з нашым* ***золдатом*** *вы дорага расквіталіся*...; [З радыёўстаноўкі:] ***Не страляйт!.. Не страляйт!..*** *Да вас ідзе парламенцёр!..* ***Не страляйт!..*** Пад нямецкамоўным уплывам назоўнік *золдатом* (ням. *Soldat* – 'салдат') ужываецца з пачатковым гукам [з], а не [с], а таксама з [о], а не з [а] у першым перад- і ў паслянаціскным складзе; дзеяслоў (не)*страляйт* мае граматычную форму, не характэрную для беларускай літаратурнай мовы;

б) руска-нямецкія ўкрапіны. Яны сустракаюцца ў маўленні немцаў, якія гавораць па-руску, і перадаюцца графічнымі сродкамі рускай мовы: [Радыёголас:] *Даем тридцать* ***минута на подумать! Польчаса на подумать!.. Карашо подумайт,*** *и будете жить!* Вынікам нямецкамоўнага ўплыву з'яўляецца ўжыванне рускамоўных лексем з адступленнем ад літаратурных нормаў – фанетычных (*польчаса, карашо*), сінтаксічных (*тридцать* <u>*минута*</u> <u>*на подумать*</u>) і марфалагічных (*подумайт*).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

II. Змешаныя ўкрапіны. Да іх належаць кантамінаваныя, а таксама частковыя ўкрапіны – словы або выразы з нямецкай мовы, якія перадаюцца сродкамі беларускай або рускай графікі:

1. [Радыёголас:] ***Ахтунг! Ахтунг!**.. Маёр **Авілоф!**.. **Ві** дастойны самай **вісокая ўзнагарода** за **ваш** мужнасць!.. І ўзнагарода вам, і **ваш зольдат** будзе жыццё, калі вы загадаеце **свайму гарнізон** скласці **зброя** і выйсці з **форт** у 17.00. **Ві смелы зольдаты**, таму смела **прызнайт**, што далейшая абарона ёсць глупства...* У гэтым прыкладзе ўжываюцца частковыя нямецкамоўныя ўкрапіны (словы-сказы *Ахтунг! Ахтунг!* – ням. *Achtung*! 'увага!' у беларускамоўным графічным афармленні) і кантамінаваныя (фанетычныя: *Авілоф, ві* 'вы', *вісокая*, марфалагічныя: *прызнайт*, сінтаксічныя: *самай вісокая ўзнагарода за ваш мужнасць!; загадаеце свайму гарнізон; скласці зброя і выйсці з форт* і фанетычна-сінтаксічныя: *ваш зольдат будзе жыццё, смелы зольдаты*).

2. [Радыёголас:] ***Зольдаты!** Калі ваш камандзір **Авілоф не** пушчай **вас** – звяжыце яго і прывядзіце **да нам!**.. **Ві алес** будзеце жыць!* Тут *алес* (ням. *alles* – 'усё') – частковая нямецкамоўная ўкрапіна; астатнія ўкрапіны кантамінаваныя: фанетычныя (*зольдаты, Авілоф, ві* 'вы'), сінтаксічныя (*не пушчай вас, прывядзіце да нам*).

3. [Радыёголас:] *Руски **зольдат**, руски **официр**! Ви **ошень карашо обороняйт**! Но **зашем** вам **погибайт**? Войска фюрера уже **нах** Минск и **пошель-пошель нах** Москва. А вам **помощь** нет! **Вода** у вас нет! **Патроноф** мало, а у нас **ошень** много!.. Сдавайтесь!.. Будуте жить!* Тут *нах* (ням. *nach* 'на') – частковая ўкрапіна, *зольдат, официр, ошень, карашо, пошель-пошель, патроноф* – кантамінаваныя фанетычныя, *помощь нет, вода нет* – сінтаксічныя, *зашем вам погибайт*? – фанетычна-сінтаксічная.

4. [Крафт:] ***Найн!**.. Вельмі не сур'ёзна!.. У вас няма вады... **Хлепа**. Змушаны адбіваць у нашых **зольдат** зброю, патроны...* Тут змешана ўжываюцца частковая нямецкамоўная ўкрапіна (*найн!* – ням. *nein* 'не') і дзве кантамінаваныя фанетычныя (*хлепа, зольдат*).

Экспрэсіўна зніжаныя адзінкі. Яны выражаюць камічны эфект, паколькі не адпавядаюць агульнапрынятай маўленчай норме, яе эстэтычным патрабаванням.

1. Словы: [Зімін:] *Бадай палову* [нямецкай] *дывізіі **ўхайдокалі** на подступах да крэпасці...* Экспрэсема *ўхайдокалі* – праст. 'пазбавілі жыцця, забілі'.

2. Свабодныя словазлучэнні: [Трубачоў:] *То-то, бачу, **немчура навалілася** на Усходні форт...*; [Кантарыя:] ***Бугай таўстаморды!*** [пра нямецкага салдата]. Камічную функцыю выконваюць: *немчура навалілася* (*немчура* – праст. зневаж. 'немцы', разм. *навалілася* – 'напала') і *бугай таўстаморды* (*бугай* – перан. зневаж. 'фізічна здаровы, рослы мужчына', *таўстаморды* – праст. груб. 'з тоўстай мордай').

У ролі экспрэсіўна зніжаных адзінак ужываюцца прыдаткі розных тыпаў:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– неразвітыя: [Марасян:] *Ты. Сарваў усю аперацыю!* [Кукушкін:] *Як?* [Марасян:] *Трэба было ратаваць, ці не, калі ўжо наткнуліся на цябе,* ***ішака?!*** Тут *ішак* – перан. лаянк. 'чалавек, які пакорліва, маўкліва выконвае самую цяжкую працу';

– развітыя: [Кантарыя:] *Не спадабалася... Ух ты,* ***фашысцкая морда!..*** Вылучаны тлустым шрыфтам выраз ужываецца як цэласная адзінка з лаянкавым значэннем. Адмоўная канатацыя выразу – вынік сумарнай экспрэсіі яго складнікаў: *морда* (ужыты з сінекдахічным значэннем 'вылюдак') і *фашысцкая* (рэалізуе сінкрэтычнае значэнне: узуальнае 'якая мае адносіны да фашыста' і аказіянальнае, кантэкстава абумоўленае, – 'лютая, дэспатычная, бязлітасная').

3. Фразеалагізмы. Камічны эфект дасягаецца за кошт іх зніжанай экспрэсіі: [Крафт:] *А калі сур'ёзна, то* ***не валяй Ваньку****, як у вас кажуць.* Фразеалагізм *не валяй Ваньку* – праст. неадабр. 'не вядзі сябе несур'ёзна, не наступай не так, як трэба' (параўн. з сінанімічным фразеалагізмам *не валяй дурня*).

Экспрэсіўна зніжаныя адзінкі могуць ужывацца канцэнтравана, што садзейнічае інтэнсіфікацыі камічнага эфекту: [Крафт:] *Ты што, і праўда –* ***прыдурак*** *ці* ***дурня з сябе строіш****?* Назоўнік *прыдурак* – праст. 'дурнаваты', фразеалагізм *дурня з сябе строіш* – праст. неадабр. 'вядзеш сябе несур'ёзна, паступаеш не так, як трэба'.

Метанімізмы. Яны ўзнікаюць пры абазначэнні прадмета паводле адной з яго адметных прымет: [Авілаў:] *Ой глядзіце, таварышы капітаны! Занадта ўжо многа* ***кубікаў*** *круціцца вакол вашых жонак.* [Трубачоў:] *Нашы жонкі больш хінуцца да* ***шпал****.* Параўн.: *кубікі* – 'знакі адрознення сярэдняга каманднага саставу ў Савецкай Арміі (да 1943 г.)' і *кубікі* – 'афіцэры сярэдняга каманднага саставу' (з гэтымі знакамі), *шпалы* – разм. 'знакі адрознення (у выглядзе прамавугольніка) у старшага каманднага саставу ў Савецкай Арміі (да 1943 г.) і *шпалы* – 'афіцэры старшага каманднага саставу' (з тымі ж знакамі).

Каламбуры. Сустракаецца каламбур, пабудаваны на аснове міжмоўнай аманіміі. Аманімічную бінарму ўтвараюць словы з нямецкай і беларускай моў: [Зімін:] *Што дрыжаць калені, ваяка?* [Салдат (не разумее):] ***Я, я****.* [Кантарыя:] *Ты што мне туту –* ***я, я****!.. Ты ўжо не* ***я****, а нуль.* Таксама: [Салдат:] ***Я, я.*** [Кантарыя:] *А я на тваім месцы гаварыў бы –* ***я не я*** *і хата не мая.* У аснове каламбураў – супастаўленне міжмоўных амонімаў: ням. *я* (ja)[1] ('так, згодзен') і бел. *я*[2] ('сам як асоба'). Камізм грунтуецца на непаразуменні персанажаў, кожны з якіх у "я" ўкладвае розны змест.

Лексічныя аказіяналізмы. Адны з іх утвораны ад уласна беларускіх слоў, другія – ад іншамоўных. Такія аказіяналізмы выражаюць камічны эфект, паколькі ўспрымаюцца як своеасаблівыя маўленчыя экзатызмы і, апрача таго, маюць зніжаную экспрэсію: [Зімін:] *Я, я па-іхняму* [панямецку] – *так, так...* [Кантарыя:] *Ён толькі і будзе зараз* ***татакаць****...*; [Салдат:] *Хайль Гітлер!* [Кантарыя:] *Ён цябе* ***адхайляе****...*Тут *татакаць* – разм. пагард. 'паўтараць тое ж самае' (ад *так* ← ням. *ja*),

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адхайляе – праст. зневаж. 'пакажа, правучыць, адпомсціць' (ад ням. *хайль*: у выразе *Heil Gitler! – Гітлеру ўра!, Гітлеру прывітанне!*).

Сінтаксічныя аказіяналізмы. Гэта выразы, якія ўзнікаюць у выніку наўмыснага парушэння правілаў традыцыйнай спалучальнасці слоў: [Трубачоў:] *Каторы раз прашу вас: дайце мне* ***развод з тэхнікай.*** [Авілаў:] *Тэхніка не жонка, а я табе не загс.* Камічны эфект выклікае аказіянальнае словазлучэнне *развод з тэхнікай*, якое Авілавым успрымаецца як алагізм (сведчанне таму – яго рэпліка *Тэхніка не жонка, а я табе не загс*).

Парэмійная алюзія. Гэта адзін з прыёмаў творчай апрацоўкі прыказкі (ужыванне ў кантэксце яе паасобных кампанентаў ці блізкіх ім паводле значэння слоў), якая і ў дэфармаваным выглядзе не страчвае сувязі з прататыпам: [Авілаў (у палявы тэлефон):] *Тое, што было,–* ***толькі кветачкі***... *А* ***зараз пасыплюцца ягадкі***... *Вагой па тоне*... Тут *ягадкі* – перан. іран. 'авіябомбы'. Вылучаныя тлустым шрыфтам словы намякаюць на прыказку *Гэта яшчэ (толькі, пакуль) кветачкі, а ягадкі наперадзе (уперадзе, яшчэ будуць)* са значэннем 'гэта яшчэ толькі пачатак, а галоўнае наперадзе' (кажуць, калі што-н. непрыемнае, нежаданае толькі пачынаецца, а ўсё горшае яшчэ наперадзе').

Пераўвасабленне. Камічна насычанымі з'яўляюцца сцэны, у якіх персанажы-суразмоўнікі як бы пераўвасабляюцца, прыкідваюцца не тымі, кім яны ёсць на самай справе, што і адлюстроўваецца ў іх маўленні: [Зіна:] *Ну гэта вы ўжо, як той цюцік. Нават пагладзіць хочацца.* [Санін:] *Толькі не супроць шэрсці.* [Зіна:] *Ды вы ж не злы.* [Санін:] *Ратуй божа. Мяне нават на раменьчыку можна вадзіць.* [Зіна:] *Трэба паспрабаваць калі-небудзь.* [Санін:] *Навошта – калі-небудзь? Сходзім паслязаўтра ў загс – і ў той жа дзень можаце купляць ашыйнік.* Кожны з персанажаў у сваё маўленне адначасова ўкладвае пераносны і прамы сэнс, у выніку чаго і ствараецца эфект тонкага гумару. Прыём пераўвасаблення садзейнічае стварэнню так званай "двайной семантычнай актуалізацыі": рэплікі персанажаў успрымаюцца як у прамым, так і ў пераносным сэнсе.

Параўнанні. З камічнай функцыяй ужываюцца параўнанні, у якіх тэма і рэма выражаны словамі лексічна-семантычных груп "чалавек – заонім" ([Зіна:] *Ну гэта вы* [Санін] *ужо,* ***як той цюцік****. Нават пагладзіць хочацца.*) або "абстрактнае паняцце – канкрэтны прадмет" ([Зімін:] *Стратэгія іх* [немцаў] *простая,* ***як агурок****.*).

Комплексныя сродкі. Гэта разнатыпныя вербальныя сродкі, якія ўжываюцца ў межах адной рэплікі і з дапамогай якіх ствараецца насычаны камічны эфект: [Кантарыя:] *Вой! Там адна Арлова чаго варта! Як яна гэта самае:* ***"Я вся горю, не пойму отчего..."*** *У самога* ***душа гарыць!..*** [Авілаў:] *Ну добра, сяржант. Ідзі выпі халоднай вады.* Камічны эфект выражае цытата *Я вся горю, не пойму отчего*... і (асабліва) фразеалагічны каламбур, які ўтвараецца ў выніку дэфразеалагізацыі ўстойлівага выразу: *душа гарыць* першым персанажам ужываецца як фразеалагічная адзінка (разм. 'хто-н. вельмі ўсхваляваны, узбуджа-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ны'), а другім успрымаецца (пад уплывам актуалізатара *выпі халоднай вады*) як сінтаксічная, г. зн. з прамым значэннем.

Заключэнне

Такім чынам, для дасягнення камічнага эфекту ў п'есе выкарыстоўваюцца розныя вербальныя сродкі – як спецыялізаваныя (міжмоўнааманімічныя каламбуры), так і (найчасцей) неспецыялізаваныя (іншамоўныя ўкрапіны розных тыпаў, экспрэсіўна зніжаныя адзінкі, метанімізмы, параўнанні, сінтаксічныя і лексічныя аказіяналізмы і інш. У рэалізацыі моўнымі адзінкамі камічнай экспрэсіі важную ролю адыгрываюць актуалізатары, а ва ўзмацненні яе – інтэнсіфікатары.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Усікаў, Я.К.*** Губарэвіч Кастусь / Я.К. Усікаў // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўнік: у 6 т. Т. 2. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь, Беларус. Энцыкл.; пад рэд. А.В. Мальдзіса; рэдкал.: І.Э. Багдановіч і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 274.
2. ***Няфёд, У.*** Драматург-грамадзянін: да 75-годдзя з дня нараджэння Кастуся Губарэвіча / У. Няфёд // Полымя. – 1982. – № 1. – С. 208-211.
3. ***Семяновіч, А.А.*** Кастусь Губарэвіч // А.А. Семяновіч Гісторыя беларускай савецкай драматургіі: 1917 – 1955 гады: вучэб. дапам. – Мінск: Вышэйш. шк., 1990. – С. 234-253.
4. ***Усікаў, Я.*** Беларуская камедыя / Я. Усікаў. – Мінск: Вышэйш. шк., 1973. – 192 с.
5. ***Сабалеўскі, А.*** Кастусь Губарэвіч / А. Сабалеўскі // Беларуская савецкая драма / А. Сабалеўскі. – Мінск: Маст. літ., 1972. – Кн. 2. – С. 86-118.
6. ***Усікаў, Я.*** Пафас лірычнай камедыі / Я. Усікаў // Полымя. – 1970. – № 10. – С. 166-178.

Паступіў у рэдакцыю 10.11.2009 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова